В.С. Зязюлькіна
(настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Сярэдняя школа № 4 г. Віцебска”)

УЗБАГАЧЭННЕ ФРАЗЕАЛАГІЧНАГА ЗАПАСУ МОВЫ ВУЧНЯЎ

Фразеалагізмы – моўныя адзінкі раздзела “Фразеалогія”, таму іх вывучэнне з’яўляецца неад’емнай часткай курса беларускай мовы ў школе. Унікальнасць фразеалагізмаў раскрываецца праз іх выяўленчыя магчымасці і кодавую інфарматыўнасць нацыянальнага пазнання свету.

Беларуская мова мае развітую і багатую сістэму лексічных і фразеалагічных адзінак, з дапамогай якіх абазначаюцца самыя разнастайныя прадметы, з’явы, дзеянні і прыметы. Фразеалагізмы з’яўляюцца вобразнымі, старажытнымі па сваім паходжанні адзінкамі мовы, бо яны захоўваюць адбіткі архаічнага мыслення. “Фразеалагічны фонд мовы – гэта каштоўная лінгвакраіназнаўчая спадчына, у якой адлюстравана гісторыя, нацыянальная культура, своеасаблівае бачанне свету пэўнага этнасу” [1, с. 4].

Мэта вывучэння фразеалагічных адзінак – фарміраваць у вучняў фразеалагічныя ўменні, што будзе садзейнічаць узбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў, развіццю моўнай культуры, лагічнага мыслення, працэсу пазнання, выхаванню моўнага эстэтычнага густу, павагі да беларускага слова, забеспячэнню ўмоў для азнаямлення з моўнымі асаблівасцямі мастацкіх твораў, якія вывучаюцца на ўроках літаратуры.

Фразеалогія цесна звязана з іншымі раздзеламі лінгвістыкі. Вывучэнне фразем ідзе падчас вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі, бо фразеалагічныя адзінкі спалучаюцца са словамі, выконваюць пэўную сінтаксічную ролю.

У марфалагічным плане фразеалагізмам уласціва граматычнае значэнне пэўнай часціны мовы: значэнне прадметнасці *(адамаў яблык ‘кадык’)*, дзеянні *(табаку важыць ‘драмаць’, пускаць пыл у вочы ‘падманваць, хлусіць’, у рожкі брацца ‘задзірацца, спрачацца’)*, прыметы прадмета *(лыкам шыты ‘неадукаваны, прастакаваты’, не лыкам шыты ‘не горшы за іншых’, востры на язык ‘гаваркі, схільны да балбатлівасці’)*, прыметы дзеяння *(без аглядкі ‘хутка’, звон у звон ‘дружна, мірна’, на сваіх дваіх ‘пешшу’, рукамі і нагамі ‘рашуча’)*, колькасці *(чортаў тузін ‘трынаццаць’)*. Гэтым самым фразеалагізмы набліжаюцца да часцін мовы, аб’ядноўваюцца ў семантыка-граматычныя разрады, суадносныя з часцінамі мовы, што дазваляе шырока знаёміцца з фразеалагізмамі падчас вывучэння назоўнікаў, дзеясловаў, прыметнікаў, прыслоўяў.

Напрыклад, выкананне наступнага задання дапаможа не толькі замацаваць веды па тэме “Скланенне лічэбнікаў”, але і паспрыяе пашырэнню фразеалагічнага запасу мовы вучняў.

Репозиторий ВГУ

Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя кампаненты-лічэбнікі ў патрэбнай склонавай форме. Запішыце. Растлумачце значэнне фразеалагізмаў.

1) іграць *(першую)* скрыпку *(быць галоўным у якой-небудзь справе);*

2) палка з *(двума)* канцамі *(тое, што можа скончыцца добра і дрэнна);*

3) за *(сямю)* пячаткамі *(быць недаступным, прыхаваным);*

4) у*(адзін)* міг *(адразу ж, імгненна, вельмі хутка);*

5) між *(двух)* агнёў *(у становішчы, калі небяспечна з абодвух бакоў);*

6) *(сем)* пятніц на тыдні *(вобразна характарызуе людзей нясталых, якія часта і лёгка мяняюць свае рашэнні, намеры, настрой, не выконваюць абяцанага);*

7) да *(сёмага, дзясятага)* поту *(да поўнай знямогі, стомы працаваць);*

8) у *(чатырох)* сценах сядзець *(не маючы ні з кім зносін, у адзіноце);*

9) адным стрэлам забіць *(двух)* зайцоў *(выканаць адначасова дзве розныя справы, дасягнуць дзвюх розных мэт)* [2].

Акрамя намінатыўнага, фразеалагізмы маюць яшчэ і стылістычнае значэнне, якое выражае экспрэсіўна-ацэначную афарбоўку, указвае на магчымасць ужывання ў маўленчай сітуацыі пэўнага стылю мовы. Увага да стылістычнага значэння садзейнічае асэнсаванню фразеалагізмаў як змястоўных, трапных, каларытных утварэнняў.

Вывучэнне фразеалагічных адзінак заснавана на ўліку ўнутраных сэнсавых сувязей паміж імі, характар якіх вызначаецца кантэкстам, які ўяўляе сабой своеасаблівую маўленчую арганізацыю сэнсавага характару. Пры такім падыходзе развіваюцца пазнавальныя здольнасці вучняў, у іх фарміруецца цікавасць да працы даследчыка мовы.

Сістэматычная праца па вывучэнні, тлумачэнні і ўжыванні фразеалагічных адзінак вучнямі ў сваім маўленні садзейнічае развіццю культуры мовы навучэнцаў, развівае ўменне карыстацца даведачнай літаратурай, узбагачае слоўнікавы і фразеалагічны запас навучэнцаў, спрыяе выхаванню любові да роднай мовы, выклікае павагу да працы лінгвістаў, да беларускага народа – творцы мовы.

Карпатлівая праца на ўроках падштурхоўвае многіх вучняў да больш паглыбленага вывучэння фразеалагізмаў. Сафронава Наталля на працягу двух гадоў (у дзявятым і дзясятым класах) праводзіла даследчую дзейнасць па тэме “Канцэпт «душа» ў мове і культуры беларускага народа”. Гэта даследчая праца прадстаўлялася вучаніцай на канферэнцыях рознага ўзроўню і адзначалася дыпломамі пераможцы. Самыя значныя з іх: “Эўрыка-2017” (Дыплом III ступені); XIV навукова-практычная канферэнцыя “Альтаір” (Дыплом II ступені).

Прапаноўваем частку даследчай працы “Канцэпт «душа» ў мове і культуры беларускага народа”.

Репозиторий ВГУ

У “Слоўніку фразеалагізмаў” зафіксавана вялікая колькасць фразеалагізмаў, якія ўтрымліваюць лексему *душа* [2]. Спрабуючы вызначыць адметнасці канцэпту “душа”, мы вылучылі 115 фразеалагічных адзінак. Прааналізаваўшы лексічнае значэнне абраных фразеалагізмаў, мы паспрабавалі размежаваць іх па групах. Азнаёміўшыся з параўнальна-супастаўляльным аналізам беларускіх і рускіх фразеалагізмаў з кампанентамі “душа” і “сэрца” ў артыкуле В.У. Праконінай “Канцэпты душа і сэрца ў беларускай і рускай фразеалогіі” [3], прапануем наступную класіфікацыю беларускіх фразеалагізмаў з кампанентам “душа”:

1. Душа як сутнасць чалавека, як маленькая істота. Яна атаясамліваецца з асобай, бо кожны чалавек валодае непаўторнай душой. Колькі людзей, столькі і душ. Пра разнастайнасць маральных характарыстык чалавека сведчаць наступныя фразеалагізмы: *заячая душа, папяровая душа, чарнільная душа, мёртвыя душы, без душы, без духу*. Душа можа выступаць як унутранае “я”. Такія фразеалагізмы характарызуюць унутраны свет чалавека *(з дарагой (мілай) душой, ад шчырай душы, з чыстай душой)*. Душа атаясамліваецца і з рысамі чалавека, напрыклад, фразеалагізм *душой і целам*. Ён кажа пра вышыню чалавечай годнасці, пра гонар чалавека. Тым самым яшчэ больш павялічваецца каштоўнасць душы чалавека.

Шматлікія фразеалагізмы характарызуюць чалавека праз яго адносіны да іншых і раскрываюць уменне сябраваць, быць сапраўдным сябрам. Напрыклад, вельмі дружна жыць ці пражыць у поўнай згодзе: *адным духам, у адзін дух,* ‘аднадушна, дружна, згодна гаварыць’, *душа ў душу, у адзін дух бегчы (уцякаць), па душах гаварыць (пагаварыць)*.

Адкрываць сваю душу ‘шчыра дзяліцца з кім-небудзь сваімі думкамі, пачуццямі, перажываннямі’, *з адкрытай душой* ‘вельмі шчыра, даверліва, чыстасардэчна’, *душа раскрываецца, душа наросхрыст (нараспашку)*. Пра такога чалавека можна казаць, што ён адкрыты, прамы. Гэта добра, бо чалавек не хавае ад навакольных нічога благога. Такі чалавек дзеліцца з сябрамі сваімі думкамі, марамі, пачуццямі, можа свабодна казаць пра тое, што яму падабаецца, а што не. Ён не хавае ні любові, ні нянавісці.

Душу можна ўявіць і як маленькую істоту. Гэты вобраз зусім натуральны, таму што ў шэрагу міфаў з душой метафарычна звязаны вобраз маленькага чалавека. Напрыклад: *душа крывёй абліваецца, ні адна душа не ведае, ні душы, ёсць душа*. Душа валодае здольнасцю перамяшчацца. Да такіх фразеалагізмаў можна аднесці: *душа ў пятках, душа ў пяткі схавалася (ускочыла), душа не на месцы*. Душа, як чалавек, мае здольнасць перадаваць гукі, эмоцыі: *душа спявае (радуецца)*.

Душа прымае, душа не прымае, па душы, за мілую душу, з душой, да душы, займае дух, на дух не пераносіць (не выносіць), як маслам па душы, чаго душа жадае (пажадае), колькі душа жадае (пажадае, прымае, прыме). Такія фразеалагізмы могуць азначаць агульную ацэнку (станоўчую

Репозиторий ВГУ

ці адмоўную) Гэта значыць, што ўсё тое, што бачыць чалавек і ацэньвае, ён параўноўвае з нейкім эталонам, з нечым прыгожым, апранаючы на гэта сваю душу, якая выступае як нейкая вопратка, альбо наадварот, саму рэч. У прыведзеных фразеалагізмах душа выступае як сутнасць чалавека.

2. Душа як змяшчальня, пасудзіна. Яна можа ўжывацца ў значэнні адзення, абалонкі, сховішча, калодзежа. Душа мае магчымасць быць пустой, спустошанай запоўненай, напоўненай. Напрыклад: *да глыбіні душы*, *на дне душы* ‘унутрана, употайкі’. Можа быць “вывернутай” навыварат *выварочваць душу* ‘моцна трывожыць, хваляваць, мучыць каго-небудзь’, *пераварочваць усю душу, выліваць душу*, *выкладваць сваю душу* ‘шчыра дзяліцца з кім-небудзь сваімі думкамі,пачуццямі, перажываннямі’.

Можна *лезці ў душу* ‘даведвацца пра чые-небудзь думы, пачуцці, намеры’, як у дом, *уваходзіць у душу* ‘глыбока хваляваць, станавіцца прадметам пастаянных разважанняў, роздуму’, *закрадацца ў душу* ‘непрыкметна, мімаволі ўзнікаць, з’яўляцца’.

Можна схаваць, захаваць у душы, або класці ці пакласці ў яе, як у камору або куфар.Фразеалагізм *класці душу* можа азначаць тое, што чалавек цалкам аддаецца чаму-небудзь (працы), робіць нешта з захапленнем, стараннем. *Выкідаць з душы* –‘пераставаць кахаць каго-небудзь, любіць што-небудзь’.

Душа можа выступаць як посуд (шклянка, вядро). Посуд варта трымаць у чысціні, так, як і твар. Вельмі часта даводзіцца счышчаць бруд, які ўтварыўся ў выглядзе накіпу на сценках. Напрыклад: *пляваць у душу* ‘абражаць самае дарагое, запаветнае ў кім-небудзь’, аднак туды пляваць ні ў якім разе нельга, бо гэта апаганьванне святыні, а таксама рана ці позна адтуль самому прыйдзецца чэрпаць ваду. Такое выказванне можна параўнаць з жартаўлівай запаведдзю *Не плюй у калодзеж – спатрэбіцца вадзіцы напіцца*. Душа можа абазначаць калодзеж з вадой, альбо крыніцу, якая б’е з-пад зямлі. Напрыклад, фразеалагізмы *муціць душу* ‘выклікаць душэўныя пакуты’, *вярэдзіць душу* ‘выклікаць хваляванне, трывогу’.

3. Душа як прадмет. Яна можа ўяўляцца як тканіна: *душа разрываецца на часткі (на кускі, на кавалкі)*, як палатно: *раздзіраць душу*, *рваць душу*, прычыняючы ёй або яе ўладальніку жорсткія пакуты. Душа як старонка або кніга: *ад чыстай душы, чытаць у душы, заглядваць у душу*. Душа як прадмет, які размяшчаецца на гарызантальнай паверхні: *каменем ляжыць на душы*, *душа не ляжыць*; прадмет, які можна раздзяліць на часткі, вызначыць яго масу: *усёй душой, усімі сіламі душы, з лёгкай душой, з цяжкай душой, наступаць на душу, як камень з душы зваліўся*. Душа як нацягнутыя і здольныя гучаць струны ці нават жылы. З аднаго боку фразеалагізм *цягнуць душу* можна параўнаць з адзінкай *цягнуць жылы* з небяспекай парваць іх.

Душа як звычайны матэрыяльны орган, які можа балець, ныць і гэтак далей. Да такіх фразеалагічных адзінак можна аднесці наступныя: *душа*

Репозиторий ВГУ

баліць, душа заныла, душа ные (ныла), балець душой, труціць душу, *падаць духам, занепадаць духам, з душы верне.* Душа як цвёрды прадмет, які можна драць, скрэбці: *кошкі душу скрабуць, скрэбці за душу, кошкі на душы скрабуць, вымаць душу, вытрасці душу, вымотваць душу, ад'ядаць душу, ад'яда душы, выяда душы, выядаць душу*.

4. Душа як духоўны пачатак (як несмяротная і нематэрыяльная частка чалавечай істоты), пад уплывам хрысціянскага веравучэння, з'яўляецца элементарным міфалагічным уяўленнем. Гэта орган, з дапамогай якога чалавек адчувае містычны свет *(аддаваць Богу душу, Богу душой не вінават, вісець над душой, стаяць над душой, святым духам, як бог на душу пакладзе).* Вобразная структура апошняга фразеалагізма сведчыць пра веру чалавека ў тое, што Бог можа забраць яго душу, і гэта будзе сведчыць пра яго фізічную смерць. Яна несмяротная, таму не залежыць ад цела і можа існаваць па-за ім.

5. Душа як стыхія, вогненная або паветраная. *Душа гарыць, ледзяніць душу*, *душа кіпіць*. Душа як паветра: *душа вон, удыхнуць душу, дух вон, дух выпусціць, дух спускаць.* Яно ўваходзіць і выходзіць з лёгкіх чалавека разам з яго дыханнем і за ім трэба пастаянна сачыць: *бавіць дух* або *адводзіць душу*.

Канцэпт "душа" вельмі значна і рознабакова адлюстроўваецца ў моўнай карціне свету. Ён з'яўляецца вынікам аб'яднання слоўнікавага значэння слова з асабістым вопытам чалавека.

Веданне фразеалагічных адзінак, дарэчнае іх выкарыстанне ў маўленні ўзбагачае мову вучняў, надае ёй вобразнасць, самабытнасць, выразнасць, фарміруе такія выдатныя якасці розуму, як арфаграфічная зоркасць, назіральнасць, пачуццё гумару. Сістэматычная праца па вывучэнні, тлумачэнні і ўжыванні фразеалагізмаў вучнямі ў сваім маўленні садзейнічае развіццю культуры мовы навучэнцаў, развівае ўменне карыстацца даведачнай літаратурай, узбагачае слоўнікавы і фразеалагічны запас, спрыяе выхаванню любові да роднай мовы, выклікае павагу да працы лінгвістаў, да беларускага народа – творцы мовы.

Літаратура

1. Дзядова, А.С. Чалавек у люстэрку беларускай фразеалогіі і парэміялогіі: манаграфія / А.С. Дзядова. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – 161 с.

2. Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. Т 1. А – Л / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1993. – 590 с.

3. Праконіна, В.У. Канцэпты душа і сэрца ў беларускай і рускай фразеалогіі / В.У. Праконіна // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы [БДУ] / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск: РІВШ, 2009. – Вып. 8. – С. 126–130.

Репозиторий ВГУ